**Стальмачонак, Л.** Бог быў побач / Л. Стальмачонак // Браслаўская звязда. — 2014. — 15 лют. — С. 1—2.

**БОГ БЫЎ ПОБАЧ**



Афганская вайна назаўсёды засталася ў памяці тых, хто сустрэўся з ёю непасрэдна, – воінаў-інтэрнацыяналістаў. З нашай мясцовасці 3 маладыя юнакі трапілі на тую вайну: П. Лукоўскі, П. Ліпатаў і С. Шваб. На жаль, жыццё першага з іх абарвалася ў 1991 г. з-за атрыманых на вайне раненняў. Два другія і зараз жывуць у нашым аграгарадку. Напярэдадні юбілейнай даты – вываду войскаў з Афганістана – мы наладзілі сустрэчу вучняў з удзельнікам той вайны Станіславам Швабам. Ён расказаў школьнікам пра самыя яркія ўспаміны.

Станіслаў Браніслававіч Шваб нарадзіўся ў в. Самуйлы Браслаўскага раёна. У 1980 г. скончыў Іказненскую сярэднюю школу, год працаваў у калгасе імя Чарняхоўскага. А ў 1981 г. быў прызваны ў армію. Як успамінае Станіслаў Браніслававіч, яшчэ на провадах госці казалі, што, магчыма, ён будзе служыць дзе-небудзь за мяжой. І ў яго самога ўжо тады было прадчуванне, што трапіць у Афганістан.

Сем сутак пасля размеркавання ў Мінску іх везлі да Узбекістана. Там побач з горадам Тэрмез размяшчаўся вучэбны палігон, на якім знаходзілася каля 3,5 тысячы салдат розных нацыянальнасцей, большасць з якіх складалі беларусы, таджыкі, узбекі. Тры месяцы праходзілі курс маладога байца, а яшчэ праз месяц, 1 чэрвеня, ім выдалі ваенную форму і на верталёце перавезлі праз мяжу на тэрыторыю Афганістана. У правінцыі Кундуз размяшчаўся 142 мотастралковы полк, дзе яму і прыйшлося праходзіць сваю службу.

Яшчэ падчас вучобы ў школе Станіслаў атрымаў пасведчанне вадзіцеля, таму яму адразу даручылі машыну БРДМ. У абавязкі Станіслава Шваба ўваходзіла суправаджэнне калоны з грузамі, якія перавозілі зброю, харчовыя тавары, паліва і інш. Калона складалася з 10–30 машын. Амаль кожны дзень даво-дзіпася ездзіць у правінцыю Лулі-Хумры, да якой дабіраліся цэлыя суткі, бо ехалі з хуткасцю 20–30 км/г. «Гэтыя 112 кіламетраў добра захаваліся ў памяці, кожны паварот, кожны кусцік памятаю і зараз», – расказвае Станіслаў Браніслававіч. – Суправаджала калону браніраваная машына, на якой сядзелі сапёры з сабакамі, у падазроных месцах правяралі, абясшкоджвалі міны. Мне часта прыходзілася ехаць у першай машыне, падстаўляць сябе пад варожыя кулі, адбівацца ад ворага, бо калоны рэгулярна абстрэльвалі, але Бог быў побач і збярог ад раненняў. Страху не было, магчыма, да канца не разумелі ўсёй небяспекі. Перамяшчацца

можна было толькі да 5 гадзін вечара. Калі ў гэты час былі ў дарозе, то спыняліся на апорных пунктах да раніцы, а тады зноў у дарогу, – працягвае свае ўспаміны С. Шваб.

На пытанне аднаго з вучняў, што ж было самым складаным, Станіслаў Браніслававіч адказаў так: «Самым цяжкім і нязвыклым напачатку нашага знаходжання ў Афгане быў клімат. Бо ў перыяд з 15 лістапада па 15 сакавіка кожны дзень ішоў дождж, а летам тэмпература паветра праграваласся да плюс 37–40 градусаў у цяні».

«Добра памятаю той дзень, калі дэмабілізаваўся. Было гэта 18 мая 1983 г. Раніцай прачнуліся, апранулі парадную форму, сфатаграфаваліся, селі ў верталёт. І толькі падняліся ўвысь, як салон напоўніўся дымам. Зноў селі, паломка аказалася нязначнай, але з-за яе спазніліся да мяжы, бо пасля 17.00 яна закрывалася. Прыйшлося затрымацца яшчэ на ноч, а раніцай на Саюз ішоў цягач, які вёз тэхніку, “абляпілі” яго і ўрэшце так пераехалі праз мяжу», – закончыў свой успамін Станіслаў Шваб.

Пасля арміі Станіслаў Браніслававіч вярнуўся ў гаспадарку, дзе працаваў шафёрам. Завочна скончыў Гарадоцкі тэхнікум. Быў ён рыбаком, механікам, інжынерам і нават старшынёй калгаса, начальнікам участка.

С. Шваб мае шэраг узнагарод, сярод якіх медаль «За адвагу», граматы Вярхоўнага Савета СССР, значок «Воін-інтэрнацыяналіст» і інш.

Жанаты, мае 2 дзяцей і ўнучку.

Жыццё працягваецца, але тыя страшэнныя гады для воінаў-афганцаў, як і для Станіслава Шваба, ніколі не забываюцца.

***Людміла Стальмачонак,***
***намеснік дырэктара***
***па асноўнай дзейнасці Іказненскай ДСБШ***